Чэрвень 2005

№6

Інфармуй акаляючы асяродак — фарміруючы нацыю

# інфарматар

www.3dway.org




KAMUNIKAT.org

## У нумары:

### Трансфармацыя луканомікі

ніякія словы не гавораць аб пануючым рэжыме
гэтак красамоўна, як яго эканамічная палітыка.

*стр. 7-8*



*стр.6*

Выдаецца з 10 Студзеня 2005г.

Сергей Синькевич

# Третья революция

**Кажется, нет другого такого слова, которое было бы столь популярно в наше время и при этом обладало бы столь противоположными смыслами, как революция.**

Для кого-то это слово связано с картинами преступления и убийства, другому оно сулит избавление, третьему несет страх перед неминуемой расплатой. По мнению одних, революция — безусловное «добро», другие же убеждены в прямо противоположном. Кого-то революция из полной безвестности и ничтожества возносит на вершину мира, иного, напротив, сбрасывает с пьедестала, уничтожая морально и зачастую физически. Нередко первое, второе и третье переплетаются в судьбе одного и того же человека.




Мы знаем, что революции нередко заканчиваются террором. И чем выше революционный накал, тем более кровавым и беспощадным бывает террор. Мы все, живущие на обломках Советской Империи, являемся прямыми потомками той Великой революции и последовавшего за ним Великого террора. Наша страна с ее политической системой есть попытка сохранить тот космический порядок, и наше замутненное мифами сознание есть продукт того эксперимента по созданию нового человека.

Но мы знаем, что бывают и другие революции. Конец XX — начало XXI века явили нам тип бескровных «вельветовых» революций. Такая революция стала для нас желанной. Мы ожидаем, что она станет торжеством свободы и справедливости. Мы смотрим на наших соседей, на Грузию, Украину, и думаем: «У них получилось, значит и у нас получится. Ведь мы такие же, как они, а они такие же, как мы».

Получится ли? — большой вопрос. Имеем ли мы ту внутреннюю силу, энергию и волю, которую требует революция, пусть даже самая маленькая. Что должно измениться, какие внутренние факторы должны сойтись, чтобы могло произойти то, что называется революцией?

Что такое революция, каков ее исходный смысл? И как совместить в высшей степени негативные последствия одних революций и позитивные — других. Почему одни революции заканчиваются террором (как в Советской России), а другие становятся победой вполне демократических ценностей (как в странах Восточной Европы)? Почему революции вопреки исходному позитивному смыслу — стремлению к свободе и справедливости — чаще рискуют не оставить от свободы и справедливости камня на камне? Почему даже те революции, которые завершились победой сил разума и созидания, так часто вызывают горечь разочарования последующим развитием событий?

Нам важно понять смысл революции потому, что это — один из тех феноменов, которые дают ключ к пониманию человека, позволяют нам лучше осознать самих себя. В революционном действии проявляется одно из наиболее глубинных стремлений человека — стремление к свободе. Если попытаться дать определение человеку, то «свобода» будет именно тем словом, которое позволит уловить специфическое отличие человека от любого другого существа, реального или вымышленного.

Чем бы революция ни окончилась, следует помнить, что всякая революция движима стремлением к свободе. Революция — это протест против рабства и угнетения. «Свобода, — писал Альбер Камю, — вот принцип всех революций». Однако, вопреки этому основанию, революции не часто до-

стигают своей исходной цели. Чаще результаты революций бывают так ошеломляюще катастрофичны, что в пору усомниться в истинности отождествления революции и стремления к свободе.

Причинауказанногопротиворечия, как и непредсказуемость революционного исхода, заключается в одном важном обстоятельстве. Любое человеческое действие, в той мере в какой оно выражает природу человека, всегда осмысленно. Осмысленность означает, что мы понимаем, что мы делаем, как и с какой целью. Смысл, которым мы наполняем наши действия, и от которого зависят его результаты, сам в свою очередь основывается на том, как мы понимаем самого себя. Говоря более абстрактно, мы в наших действиях всегда исходим из того или иного понимания человека. И то, каких результатов мы достигаем, напрямую зависит от адекватности или неадекватности нашего самопонимания.

Применительно к проблеме революции, вышесказанное означает, что исход революции зависит от того, на каком понимании человека основываются революционные действия. Существо человека определяется через свободу, следовательно, наше стремление к свободе реализуется, исходя из нашего понимания того, что есть свобода.

В революциях XX века роковую роль сыграло то понимание свободы, на котором была выстроена теория, ставшая идейной основой этих революций — марксизм. А понимание свободы Марксом базировалось в свою очередь на его понимании человека.

Маркс резко противопоставлял свободу и необходимость, свободного человека и человека, зависящего от социально-экономических условий. По Марксу, человек в подлинном смысле — это свободный человек. При существующих условиях человек лишен свободы, так как скован экономическими отношениями, искажающими его подлинную сущность.

Исследуя историю экономического закрепощения человека, Маркс строит впечатляющую концепцию, объясняющую историческое развитие лежащими в его основе законами. Двигателем истории, согласно его концепции, является развитие экономических отношений, которые выстраиваются в логическую цепочку сменяющихся общественных формаций. Система социально-экономических отношений на всем протяжении человеческой истории такова, что человек оказывается ее функцией. Человек полностью обусловлен этими отношениями, а значит — не свободен.

Но человек не просто обусловлен. Существует естественная обусловленность, так как, будучи живым существом, человек зависит от биологических условий, а поскольку он еще и социальное существо, то он зависит еще и от социальных условий. Естественная (биологическая и социальная) обусловленность человека, кроме всего прочего, усугубляется еще и тем, что одни люди эксплуатируют других. Несвобода человека, таким образом, понималась Марксом как эксплуатация одних людей другими.

Маркса в его теоретических изысканиях интересовало прежде всего то, каким образом избавить человека от эксплуатации и сделать его свободным.

И он «нашел» такой способ — «коммунистическая революция». «Коммунистическая революция» — это революция особого типа. Понятие революции применялось Марксом для обозначения, по крайней мере, двух типов социальных процессов. Кроме «коммунистической революции» Маркс говорил также о «буржуазных революциях». Однако выдвинутая Марксом идея «коммунистической революции» принципиально отличалась от идеи «буржуазной революции» Если прежде революции происходили в рамках последовательного исторического процесса, то «коммунистическая революция» выводит за пределы истории. Смысл «коммунистической революции» для человечества в том, чтобы не просто перейти на новую историческую ступень, но с ее помощью выйти из истории или по меньшей мере учредить новый принцип человеческой истории, не имеющий ничего общего с прежним социально-экономическим детерминизмом.

«Коммунистическая революция» есть революция свободы. Через нее человечество перейдет из царства необходимости в царство свободы. «Коммунистическая революция» разрушит социально-экономический механизм, подчиняющий человека, и позволит построить человеческую жизнь на других основаниях.

Как Маркс рассчитывал достичь свободы? Очень просто — нужно всего лишь упразднить частную собственность — эту причину всех бед. Несвобода человека коренится в экономическом устройстве общества, которое основано на частной собственности. Достаточно отменить ее, чтобы человек стал свободным.

Теперь мы можем лучше представить, как Маркс понимал свободу и свободного человека.

Маркс считал, что свобода это состояние, которое имеет социально-экономическую природу. Этим подразумевалось, что свобода человека зависит от общества. Тем самым признавался общественный, то есть неиндивидуальный характер свободы. Человек только тогда станет свободным, когда он избавится от индивидуальных различий, разделяющих людей друг от друга.

Все что разделяет людей, что подчеркивает индивидуальность, особенность, уникальность каждого человека, — все это искажает его подлинную сущность. И это делает человека не-

**«Коммунистическая революция» есть революция свободы. Через нее человечество перейдет из царства необходимости в царство свободы.**

свободным. Свободный человек — это всеобщий человек, лишенный индивидуального своеобразия.

Это представление сыграло поистине роковую роль в XX веке. Революционные вожди умело воспользовались этой теорией. Если свобода есть уничтожение частной собственности и индивидуального своеобразия, то, чтобы достичь свободы, нужно это сделать. Революционный Террор есть не что иное, как попытка уничтожения индивидуальности, личности. Революционный Террор не имеет конца, так как, сколько бы ни уничтожалась индивидуальность, до конца ее можно уничтожить, лишь истребив всех людей до единого.

Наверное, нет более искажающего суть вещей понятия свободы и понятия человека, чем то, которое было дано Марксом. Свобода не только не отрицает необходимость, но напротив, оба эти понятия обуславливают друг друга. Невозможно себе составить внятное понятие о свободе как таковой, то есть об «абсолютной» свободе. Нельзя помыслить свободу без того, чтобы одновременно мыслить необходимость. Абсолютная свобода — это противоречивое и пустое понятие, которому в мире ничего не соответствует.

Маркс ошибался не в том, что развивал теорию социально-экономического детерминизма, и не в том, что стремился к освобождению человека. Его главной ошибкой было радикальное противопоставление свободы и необходимости. И это противопоставление исходило из неверного понимания сущности человека.

Вопреки Марксу сущность человека складывается из двух элементов. «Человек, — писал датский философ Серен Киркегор, — это синтез свободы и необходимости, временного и вечного, конечного и бесконечного». Отрицая один из элементов, мы тем самым теряем и другой.

Что такое свобода? Свобода это не состояние, как думал Маркс, при котором человек свободен от внешних ограничений. Такая свобода напоминает парение в невесомости, когда невозможно двинуться ни в ту, ни в другую сторону, так как не от чего оттолкнуться.

**СВОБОДА ВСЕГДА СВЯЗАНА С РИСКОМ. ВЫБИРАЯ, МЫ РИСКУЕМ, ТАК КАК МОЖЕМ ОШИБИТЬСЯ И ПОТЕРЯТЬ ВСЕ, ЧТО ИМЕЕМ. СОЗНАТЕЛЬНО ИДЯ НА РИСК, МЫ ТЕМ САМЫМ БЕРЕМ НА СЕБЯ ОТВЕТСТВЕННОСТЬ ЗА НАШ ВЫБОР И ЕГО ПОСЛЕДСТВИЯ.**

Свобода всегда сопряжена с усилием и выбором. Свобода состоит в том, что приходится прилагать усилия, чтобы преодолеть сковывающие нас ограничения. Свобода реализуется в ситуации, когда мы вынуждены выбирать из двух или нескольких возможностей, при этом мы никогда не уверены, какой выбор был бы правильным. Наше неведение относительно нашего будущего есть одно из тех ограничений, которые составляют условие нашей свободы.

Свобода всегда связана с риском. Выбирая, мы рискуем, так как можем ошибиться и потерять все, что имеем. Сознательно идя на риск, мы тем самым берем на себя ответственность за наш выбор и его последствия. Риск всегда индивидуален, рискую я сам, и то, что я буду иметь в итоге, создаст мою неповторимую судьбу, сформирует мою индивидуальность. Усилие, риск и ответственность — вот, что делает меня самим собой.

Далее, нельзя понимать свободу как состояние, в которое мы можем впасть, и потом уже ни о чем не беспокоиться. Именно так представлял себе Маркс «коммунистическое общество». Устранив частную собственность, лишив человека его индивидуального своеобразия, можно наслаждаться плодами свободы. Свобода, это не состояние, а непрекращающееся усилие, действие, акт. Свобода — это акт освобождения. Причем этот акт всегда индивидуален. Никто другой не сможет совершить его вместо тебя.

Исходя из данного определения свободы как индивидуального усилия, мы приходим к третьему смыслу революции, которого не знал Маркс. В такой революции утверждается ценность индивидуальности, в ней выражается протест против всего, что подавляет человеческое своеобразие и личностное начало. Это восстание против унижения человеческого достоинства, против того, чтобы кто-то другой определял твою жизнь вместо тебя.

Но такая революция не начинается на площадях и не заканчивается на них. Площадь — это лишь кульминация непрекращающегося процесса. Эта революция начинается в повседневной жизни с того, что в какой-то момент кто-то вдруг решает: «довольно, с меня хватит, я не могу больше терпеть существующего положения вещей». В этот момент просыпается сознание неподлинности собственной жизни, ее скудности и бессмысленности. Это «довольно» есть бунт против унизительного положения, в которое нас ставит общество и государство.

Социальная революция всегда начинается с индивидуального бунта. Бунтующий человек начинает действовать, он ищет других таких же, как он, бунтарей, не желающих более терпеть унижение. Эти люди, объединившись, начинают делать общее дело. Когда их наберется достаточное количество, ничто уже не сможет помешать им заявить о себе во весь голос.

# Две экономики

Отрывок из книги Матвея Малого «Как сделать Россию нормальной страной?» (http://matthew-maly.ru/books/makenormal.shtml) с.84-85



**Фараон использовал строительство пирамид, чтобы отнять у народа и уничтожить избыточные трудовые и финансовые ресурсы, которые, не будучи отняты, могли бы привести народ к экономической независимости.**

Почему фараон заставлял людей строить пирамиды? Ведь пирамиды не приносят никакой пользы. Я думаю, что приказав строить пирамиды, фараон специально уничтожал труд и ресурсы, чтобы максимизировать свою власть над людьми. Действительно, пирамиды служат доказательством того, что существовал громадный ресурсный и производственный потенциал. Может быть, слишком долго длился мир или были слишком хорошие урожаи. Так или иначе, фараону грозила серьезная опасность: вот-вот людям придет в голову построить оросительный канал. Построив оросительный канал, они разбогатеют за счет роста урожайности, и фараон боялся, что тогда он вряд ли останется у власти. Казалось бы, почему? Ведь постройка каналов увеличила бы не только богатство простых египтян, но и во много раз увеличила бы богатство самого фараона. Почему же фараон стремился этого избежать? Ведь простые люди, разбогатев, могли бы быть благодарны фараону? Однако, уверенность в своих силах, которую дает крестьянам полный амбар, может навести крестьянина на мысль о несправедливости установленных фараоном налогов. А это может поставить под угрозу власть фараона. Богатства фараона были значительны и без оросительных каналов, поэтому единственное, что должно было его интересовать — это зависимость народа от него, зависимость, которая достигается через бедность. Поэтому фараон и использовал строительство пирамид, чтобы отнять у народа и уничтожить избыточные трудовые и финансовые ресурсы, которые, не будучи отняты, могли бы привести народ к экономической независимости.

Мы пришли к интересному выводу: для сохранения своей власти цари могли не только строить пирамиды и дворцы, но и развязывать войны. Причем, война не обязательно должна быть быстротечной, бескровной и победоносной: иногда лучше пустить своему народу кровь, разорить и напугать его, а потом выступить в роли спасителя.

Бескровным и весьма эффективным методом уничтожения ресурсов являются высокие налоги. Последствия высоких налогов настолько катастрофичны и очевидны, что трудно предположить, что власть об этих последствиях не знает. Приходится предположить, что власть собирает высокие налоги не только тогда, когда предстоят значительные расходы, а прежде всего тогда, когда она боится экономической и политической самостоятельности народа.

## Мы пачынаем збор матар’ялаў для першага нумару беларускай вэрсіі “Інфарматару”.

Чаму беларуская мова?

Пачынаючы беларускамоўную вэрсію “Інфарматару”, мы набываем адназначна беларускі кантэкст. Мы выходзім за абшары расейскамоўнага інфармацыйнага мора, набываючы сваю нацыянальную адметнасьць.

Мы робім наступны крок у аб’яднаньні маладых беларускіх інтэлектуалаў, каму не роўназначны лёс Беларусі, каму ёсьць што сказаць гэтаму сьвету, хто мае ідэі, якімі можа падзяліцца, і хто пры гэтым не абмяжоўваецца аднымі словамі. Тых, хто заўтра будзе інтэлектуальнай элітай Беларусі.

Беларуская мова запатрабаваная Беларусяй. Неактуальна гаварыць аб сьмерці мовы, бо беларусы жадаюць карыстацца ёй. Мы ж не жадаем – мы карыстаемся.

Запрашаем да супрацы беларускамоўных аўтараў. Дасылайце нам свае тэксты любым правапісам (тарашкевіца, наркомаўка, традыцыйная лацінка).

Дасылайце прапановы на: bautramiej@yahoo.de




**Адыйсці ад справаў і рабіць выгляд, што сітуацыя ў краіне цябе ня тычыцца — лёгкая і простая справа. Ад нас — моладзі, а не ад пенсіянераў (з усей пашанай да іх) — залежыць НАШАЯ будучыня.**

**3dway:** Прывітаньне!
***Slavko:*** Йоў!
***Кроў:*** Прывітаньне і Вам, калі не жартуеце! (сьмяецца)
***Палкоўнік:*** Элло, хлопцы!

**3dway:** Чаму ваш праект мае назву Чырвоным па Беламу?
***Кроў:*** Назва выйшла неяк натуральна. Некаторым асобам, каб растлумачыць пэўныя рэчы, трэба пісаць «чёрным по белому», у прыпадку беларусаў — трэба пісаць і тлумачыць «чырвоным па беламу», тады суайчыньнікі лепш разумеюць (сьмяецца).
***Палкоўнік:*** Некаторыя звярталі увагу, што папраўна па-беларуску трэба пісаць «Чырвоным па Белым», але мы вырашылі пакінуць такую трохі расейскую канцоўку назвы, таму што семантычны змест назвы меў большую інфармацыйную сілу пераказу (робіць міну выкладчыка мовазнаўства).
***Кроў:*** (сьмяецца) Наш творчы запал не пахамаваць. Услухвайцеся ў тэксты і ўсе зразумееце.

**3dway:** Колькі вас?
***Кроў:*** На сённяшні момант у гурце «Чырвоным па Беламу» некалькі асобаў. Але акрамя гурта існуе яшчэ «Ч.П.Б. крю» — нашая грамада, нашыя кроўныя браты. А вось іх ужо значна больш за некалькі дзясяткаў асобаў. Гэта хлопцы і дзяўчаты, адданыя справе як музычнай, так і палітычнай.
***Палкоўнік:*** Карыстаючыся з аказіі, запрашаем жадаючых унесьці свой уклад да нашай грамады. Кантакты знаходзяцца на нашых старонках.
***Slavko:*** Нас — тысячы, за намі — мільёны.

**3dway:** Адкуль узьнікла ідэя, як вы знашлі адзін аднога?
***Кроў:*** Як мы знашлі адзін аднога? Гэта амаль дэтэктыўная гісторыя. Мама нарадзіла разам. А з Палкоўнікам не вінаватыя мы — ён сам прыйшоў. Кажа служба такая (сьмяецца)
***Палкоўнік:*** Есьць такая прафэсыя — РЭП спяваць (сьмяецца)!
***Кроў:*** Па жыцьці мы размаўляем па-беларуску. З музыкі слухаем галоўным чынам хіп-хоп. Пачалі шукаць беларускамоўныя рэп-гурты. І не знайшлі. А розныя ПамідорАФФы і таму падобныя «дыска-рэпперы» для нас не лічацца, бо гэта — нейкая сьмешная пародыя.
***Палкоўнік:*** Зьдзек над стылем і мовай.
***Кроў:*** Таму вырашылі пачаць рабіць самі. Як бачыце, атрымоўваецца. Сціпласць -нашая адменная рыса (сьмяецца).

**3dway:** Што вас натхняе? Дзе можна знайсьці вашыя песьні? Ці даяце вы канцэрты?
***Палкоўнік:*** (рагоча) Рыгорыч! Ён — ГУРУ! Без яго б нашая творчасць пакутліва сканала б па двух-трох песеньках. Вогуле, калі б ён пайшоў у комікі — грошай бы зарабіў больш, чым накраў за час свайго прэзыдэнцтва. Зуб даю!
***Кроў:*** Вусаты нас натхняе. (сьмяецца).
***Палкоўнік:*** Нашыя песьні пакуль шукайце ў сеціве на нашай старонцы www.c-p-b.tk.
***Slavko:*** Наш першы альбом у накладзе 9 мільенаў штук выкупіў наш самы вялікі фан і прыхільнік — Рыгорыч. Зараз хіба ляжаць у яго на дачы. Слухае, калі кветкі падлівае ці на лыжах у краму па булачкі езьдзіць. (сьмяецца).
***Кроў:*** Канцэрт мы дадзім на Плошчы Незалежнасьці ў дзень Перамогі над дыктатурай. А потым паедзем ў Грэцыю на Эўрабачаньне, як у гэтым годзе украінскі GreenJolie.(усміхаецца)
***Палкоўнік:*** Насамрэч, Вы разумееце, што на канцэрт, акрамя нашых фанаў, ахвотна прыйшлі б і «маскі-шоў» і «шпіёны з вельмі ўнутраных ворганаў». А спяваць для іх нам ня хочацца.

**3dway:** Што вам бліжэй: свабода магчымасьцяў ці стабільнасьць і прынцып «усім роўна»?
***Палкоўнік:*** Свабода магчымасьцяў. Яна дае сапраўднае задавальненьне і пэўную стабільнасьць, а ня прынцып — усім роўна. Бо, як паказвае недалёкая гісторыя Беларусі, заўжды знойдуцца «роўныя» і «раўнейшыя».
***Slavko:*** Мы — хлопцы правыя, а не левізна там нейкая (усьміхаецца).

**3dway:** Ці не баіцеся на палітычныя тэмы пісаць?
***Кроў:*** Ёсць такая прыказка: Лукі баяцца — на мітынг не хадзіць! Мы ходзім на мітынгі.

**3dway:** Як вы думаеце, як дагрукацца да розумаў і сэрцаў моладзі Беларусі, прычым у большай частцы простых хлопцаў і дзяўчат? Як іх пераканаць у тым, што ад іх залежыць будучыня краіны, што трэба дзейнічаць?
***Кроў:*** Мяркую, што трэба паказваць шлях уласным прыкладам. Часам трэба штосьці заахвяраваць, каб мець эфект. Адыйсці ад справаў і рабіць

**www.c-p-b.tk**

выгляд, што сітуацыя ў краіне цябе ня тычыцца — легкая і простая справа. Ад нас — моладзі, а не ад пенсіянераў (з усей пашанай да іх) — залежыць НАШАЯ будучыня. МЫ ВЫРАШАЕМ, як ЖЫЦЬ. Трэба не маўчаць. Чым даўжэй мы маўчым, тым цяжэй і горш нам будзе ў будучыні. Нават калі гэта будзе вольная будычыня. Трэба ПАЧЫНАЦЬ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ЗАРАЗ. Надыходзіць НАШ ЧАС!

**3dway:** Чаму рэп?
***Кроў:*** Рэп, таму што ён нам бліжэй за ўсе інныя музычныя плыні.

**3dway:** Якія настроі цяпер сярод моладзі, якая прапаведуе хіп-хоп?
***Кроў:*** Беларуская моладзь, незалежна ад таго, што яна слухае, мае вельмі падобны падыход да жыцця: большасць — геданісты, жывуць з дня на дзень. Гэта вялікая праблема для грамадзтва. Але апошнім часам можна заўважыць пэўныя змены ў лепшы бок. Напрыклад, возьмем пытаньне беларускае мовы. Зараз модна размаўляць па-беларуску. Мова ўрэшце перастала быць «калгаснай». Асоба, якая размаўляе на роднай мове, успрымаецца асяроддзем вельмі пазытыўна. Моладзь пачынаюць цікавіць пытаньні актуальнае сітуацыі ў краіне.
***Slavko:*** Мы верым у нашую моладзь.

**3dway:** Дзе вы знаходзіце сюжэты, тэмы для сваіх песьняў? Як яны нараджаюцца?
***Палкоўнік:*** Большасць сюжэтаў нараджвае вуліца. Людзі, з якімі кантактуем на штодзень.
***Кроў:*** Сюжэты нараджваюцца ў муках, як кожнае дзіцяці.
***Slavko:*** За якім трэба глядзець.

**3dway:** Якія вашыя творчыя пляны?
***Палкоўнік:*** Як казаў вялікі дзядуля Ленін: чытаць, чытаць і яшчэ раз чытаць… рэп, баценька (сьмяецца)!
***Кроў:*** Зараз мы працуем над другім альбумам. Працоўная назва — «Вулічныя байцы». Прасьвечваем яго тым, хто не глядзячы на цяжкасьці будаваў і будуе зараз будучыню незалежнае і дэмакратычнае Бацькаўшчыны — «краёўцам», «зубрам», «фронтаўцам», фанатам «Тарпеда-Менск» і іншым патрыётам Беларусі — сапраўдным героям нашага часу.



# Трансфармацыя луканомікі

Баутрамей Горбач

**Што нас чакае за паваротам**

Эканоміка шмат у чым ёсьць база, грунт палітычных працэсаў у краіне. І ніякія словы не гавораць аб пануючым рэжыме гэтак красамоўна, як яго эканамічная палітыка.

Пабудаваны Аляксандрам Лукашэнкам рэжым — гэта ідэалягічная, палітычная, эканамічная хімэра, якой наканаваны сумны канец. І хмары ўжо гусьцеюць над Беларусяй. Няма сумневу, што ў бліжэйшыя гады мы зробімся сьведкамі грандыёзнага відовішча злому сыстэмы лукашысцкага рэжыму — а значыцца, у першую чаргу, лукашысцкае эканомікі.

Пытаньне ў тым, якім будзе гэты злом. Ці будуць гэта рынкавыя рэформы, праграмы якіх чакаюць свайго часу на сайтах АГП і Партыі БНФ? Ці будуць гэта вымушаныя рэформы зь ініцыятывы лукашэнкаўскае адміністрацыі? Урэшце, у якім стане будзе йснаваць сам аб'ект рэформаў — беларуская эканоміка — калі надыдзе іхная магчымасьць?

Для пачатку паспрабуем разглядзець, што ў прынцыпе азначалі б перамены ў эканамічнай палітыцы ўраду Беларусі.

Перш за ўсё гэта было б зьмяншэньне ціску на бізнэс — як адміністрацыйнага ціску, так і рэфармаваньне рэпрэсіўнага ў дачыненьні да прадпрымальнікаў заканадаўства, зьмяншэньне падатковага прэсу. Гэта было б зьмяншэньне ціску на інвэстараў і пераарыентацыя дзяржаўнае палітыкі на спрыяньне замежным інвэстыцыям, на вяртаньне зьбеглых у Расею і Чэхію беларускіх капіталаў. Нельга забывацца на неабходнасьць прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў, і чым болей шырокай, тым лепей. Патрабуе радыкальных зьменаў і банкаўская сыстэма краіны. У здаровай эканоміцы Нацыянальны банк мусіць быць пазбаўлены кантролю з боку ўраду — у Беларусі падпарадкаваньне "Савету Міністраў" зацьверджанае ці не заканадаўча.
Нават такі вельмі сьціплы агляд to do list'а для будучых беларускіх рэфарматараў дазваляе нам зрабіць адну выснову, якая ляжыць на паверхні — Лукашэнка на такія крокі ня пойдзе ні пры якіх умовах.

Для немагчымасьці рэформаў зьверху, то бок немагчымасьці эвалюцыйнага сцэнару пры гэтым рэжыме, ёсьць дзьве прычыны — аб'ектыўная і суб'ектыўная. Суб'ектыўная прычына ляжыць проста ў асабістых якасьцях Аляксандра Лукашэнкі. Ён адзінаццаць гадоў будуе сваю мадэль эканомікі. Гэты чалавек паранаідальна ня здольны прызнаць уласную памылку. Нават калі ўявіць сабе разумных дарадцаў пры ім — якіх ужо даўно не засталося ў ягоным лягеры — для Лукашэнкі няма аўтарытэтаў. Урэшце, гэта чалавек проста неадукаваны, які верыць у эфэктыўнасьць каманднa-адміністратыўнай эканамічнай мадэлі. І, напэўна, Лукашэнка і ёсьць галоўным закладнікам створанай ім самім сыстэмы, дзе, баючыяся цяжкай "бацькавай" рукі, дырэктары і чыноўнікі

завышаюць фармальныя паказчыкі эканамічнага разьвіцьця, адцягваючы расплату.

Аб'ектыўная прычына ў тым, што рэформы банальна пазбаваюць рэжым крыніцаў грошай. Палітыка лукашэнкаўскага ўраду ад пачатку была накіраваная на высмокваньне з нацыянальнае эканомікі ўсіх сокаў дзеля падтрыманьня апарату прымусу, дзеля забесьпячэньня ляяльнасьці сілавых структураў, ну і на "кішэнныя" самому тырану і яго атачэньню, а ў выпадку рынкавых рэформаў дзяржава пазбавіцца магчымасьці побораў зь бізнэсу, будзе вымушаная легалізоўваць ценявы "прэзыдэнцкі" бюджэт. Пятля на шыі беларускае дыктатуры паступова звужаецца й бяз гэтага, бо якія прыгожыя лічбы не малюй у штогадовых справаздачах, а аднойчы канфлікт лічбаў з рэчаіснасьцю зробіцца крытычным і непапраўным.

Акрамя таго, рэформы ў эканоміцы распачнуць цалкам непрымальную для лукашыстаў ланцуговую рэакцыю: калі мы хочам мець спрыяльныя ўмовы для інвэстараў, спатрэбіцца, скажам, справядлівы суд з Балтыкай аб бровары "Крыніца". А паслабленьне дзяржаўнага кантролю над судом патыхае ўжо і расьследваньнямі зьнікненьняў апазыцыянэраў, і запатрабаваньнямі справядлівасьці над Марынічам, Севярынцам, Статкевічам і іншымі. Лібэралізацыя эканомікі азначае рост уплыву незалежнага ад адміністрацыі Лукашэнкі бізнэсу, зьяўленьне патэнцыйных спонсараў палітычнае альтэрнатывы. Па Карлу Марксу быцьцё вызначае сьвядомасьць — свабодная эканоміка робіць свабодным грамадзтва.

Пачаць эканамічныя рэформы, пераводзіць нацыянальную эканоміку на цывілізаваныя рэльсы — самагубства для беларускае дыктатуры, вось у чым канфлікт нацыянальных інтарэсаў зь інтарэсамі правячае ў краіне клікі. Улада загнала сябе ў тупік, зь якога выйсьце толькі адное — рэвалюцыя.

Глядзець далей, што будзе пасьля зрынаньня рэжыму, цяжка. Незразумела, якой будзе беларуская рэвалюцыя. Наколькі яна будзе бяскроўнай, наколькі яна будзе мірнай. Незразумела, што можа зрабіць з эканомікай каляпсуючы рэжым у сваёй агоніі. Карацей кажучы, не зразумелая адназначна выходная сытуацыя, у якой будзе эканоміка на апэрацыйным стале першага пост-лукашэнкаўскага ўраду.

Паспрабуем разглядзець аптымістычны сцэнар, пры якім сытуацыя застанецца такой, як зараз. Бадай што адзінай сапраўднай заслугай (ня было б шчасьця, ды няшчасьце дапамагло) Лукашэнкі і ягонага рэжыму ёсьць тое, што цяпер пры правядзеньні рынкавых пераўтварэньняў Беларусь можа вучыцца на памылках сваіх суседзяў. Дэ-факта закансэрваваўшы плянавую эканоміку, Беларусь дала фору іншым краінам Усходняе Эўропы ў правядзеньні рэформаў. Цяпер, калі асноўная, вырашальная частка рэформаў у Чэхіі, Польшчы, Вугоршчыне, Славэніі, Эстоніі, праведзеная альбо запушчаная, мы сапраўды можам бачыць вынікі іхнае палітыкі, што было зроблена слушна, якіх памылак неабходна будзе пазьбегнуць у Беларусі. Мы згубілі час, але атрымалі невялічкі шанец, што пераўтварэньні ў Беларусі будуць ня гэтак моцна біць па ўзроўню жыцьця і сытуацыя будзе не такой кепскай, якой яна была ў іншых краінах. Цалкам магчыма будзе выкарыстаць накоплены суседзямі досьвед, запрасіць кансультантаў зь ліку былых урадоўцаў і рэфарматараў Чэхіі, Польшчы, Вугоршчыны.

Але й тут размова йдзе не аб "паступовасьці", а хутчэй аб добра падрыхтаванай "радыкальнасьці" рэформаў, бо, перафразоўваючы аднаго з бацькоў рынкавых рэформаў ва Ўкраіне, "рынкавыя рэформы бываюць радыкальныя альбо няўдалыя". Досьвед паказвае, што толькі краіны, дзе была зробленая стаўка на радыкальны і бескампрамісны паварот да рынку, дасягнулі посьпеху. Гэта згаданы ўсходне-эўрапейскі "авангард", краіны-лідары рэгіёну па эфэктыўнасьці праведзеных рэформаў — Чэхія, Польшча, Вугоршчына, Эстонія, Славэнія. Прыклад зваротнага — Румынія і Баўгарыя, дзе ўрады з папулісцкіх мэтаў дэкляравалі "паступовыя рэформы", якія ў выніку абарачваліся цяжкімі крызісамі сярэдзіны 1990-х.

Перамены ў Белаурсі непазьбежныя. Гэта ня проста аптымізм, гэта ўпэўненасьць, бо верагоднасьць іншых сцэнараў для Беларусі (аншлюс да Расеі ці перадача Лукашэнкам улады "ў спадчыну") мізэрная.

Пытаньне адное — час. Час, які працуе супраць рэжыму, але і супраць эканомікі Беларусі. Чым далей, тым болей губляе канкурэнтаздольнасьць вытвораная на старэючым абсталяваньні прадукцыя. Чым далей, тым меней эканамічная мэтазгоднасьць інвэстыцый у беларускія прадпрыемствы. У адзін момант стане элемэнтарна таньней расьпілаваць састарэлыя заводы на мэталалом, чым пераабсталёўваць іх — і гэта ўжо будзе трагедыя. Крызіс набліжаецца, і пасьля яго мы можам прачнуцца ў цэнтральнаэўрапейскай Альбаніі.

Пасьля распаду СССР Беларусь згубіла непапраўна шмат часу. Непапраўна шмат людзей, непапраўна шмат капіталу — грашовага, інтэлектуальнага, рэпутацыйнага нарэшце. Рэвалюцыя ў Беларусі робіцца ня проста пытаньнем перастаноўкі краіны на больш канструктыўныя рэльсы разьвіцьця, але літаральна пытаньнем жыцьця і сьмерці Беларусі як эфэктыўнае эканомікі. Якой будзе краіна пасьля яшчэ 5 год кіраваньня некампэтэнтнымі, неадукаванымі і недобрасумленнымі людзьмі на чале з былым дырэктарам стратнага калгасу — гэта пытаньне, на якое ня хочацца даваць адказу. Гэтаму павінен быць пакладзены канец.


# информатор

**информационный листок проекта «Третий Путь»**

**Тираж:** 1 экз. для каждого читателя.
**Доступен** в электронном виде по адресу www.gazeta.3dway.org
**Распространяется** бесплатно.
**Подлежит** свободному копированию и распечатке.
**Контактная информация редакции:**
Эл. почта: pavel@3dway.org
Информатор отражает совокупность мнений своих авторов. Каждый из авторов несет персональную ответственность за достоверность и морально-этический аспект представленной в его материале информации.